ТЭЛЕПРАГРАМА НА ТЫДЗЕНЬ

№141 (1954)

Субота, 31 ліпеня 2004 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць —
5 разоў у тыдзень
Выдавец:
УП «Народная воля».

Кошт свабодны.

Народная Воля

E-mail : nv@promedia.by
http://nv.promedia.by

Надвор'е

У Мінску сёння ўдзень чакаецца — +20...+22, уначы — +14...+16; у Брэсце ўдзень — +21...+23, уначы — +13...+15; у Гродне ўдзень — +19...+21, уначы — +13...+15; у Віцебску ўдзень — +20...+22, уначы — +13...+15; у Гомелі ўдзень — +24...+26, уначы — +16...+18; у Магілёве ўдзень — +22...+24, уначы — +13...+15.

На ўсёй тэрыторыі краіны захаваецца цёплае, без ападкаў надвор'е.

www.meteo.by

У грамадзяніна Вялікабрытаніі Алана Флаўэрза забралі пашпарт

Як паведаміла Радыё Свабода, у Мінску міліцыя забрала пашпарт у грамадзяніна Вялікабрытаніі **Алана ФЛАЎЭРЗА.** Доктар Алан Флаўэрз — выкладчык ядзернай фізікі ў Кінгстанскім універсітэце ў Лондане, з 1992 года займаецца пытаннямі, звязанымі з чарнобыльскай катастрофай, радыяцыяй, аздараўленнем беларускіх дзяцей, гуманітарнымі кантактамі. Доктар Флаўэрз знаходзіцца ў Беларусі па запрашэнні Сахараўскага інстытута, дзе чытаў курс лекцый.

Апрача таго, доктар Флаўэрз — адзін з заснавальнікаў і куратараў Еўрапейскага маладзёжнага парламента. Доктар Флаўэрз выказаў меркаванне, што беларускія ўлады рыхтуюць яго дэпартацыю і што, верагодна, днямі ён будзе вымушаны пакінуць Беларусь.

Прафесар Флаўэрз з'яўляецца ганаровым прафесарам Сахараўскага інстытута, у будынку якога і адбыўся гэты інцыдэнт. У пятніцу на 3 гадзіны дня лёс прафесара з Вялікабрытаніі яшчэ не быў вызначаны.

Дэпутаты польскага Сейма пікетавалі амбасаду Беларусі

50 дэпутатаў польскага Сэйма, у тым ліку віцэ-спікер польскага парламента, правялі каля беларускай амбасады ў Варшаве акцыю пратэсту супраць парушэння палітычных правоў грамадзян Беларусі.

Віцэ-спікер Сейма заявіў таксама, што ў бліжэйшы час дэпутаты ад "Грамадзянскай платформы" ў Еўрапейскім парламенце пачнуць шырокамаштабную кампанію, мэта якой - прыцягнуць увагу Еўрасаюза да сітуацыі ў Беларусі.

"Я перакананы, што акцыя нашых дэпутатаў будзе ўспрынятая з разуменнем усімі дэпутатамі Еўрапарламента. Ужо ў хуткім часе мы будзем сведкамі вельмі сур'ёзнай акцыі ў справе Беларусі ў Еўрапарламенце", — заявіў Дональд Туск. Прысутныя сустрэлі ягоныя словы апладысментамі.

Варта адзначыць, што ліберальная партыя "Грамадзянская платформа" — цяпер найбольш папулярная палітычная сіла ў Польшчы. Вельмі верагодна, што ў наступным годзе "Грамадзянская платформа" выйграе парламенцкія выбары і ўтворыць новы ўрад, паведамляе Радыё Свабода.

МИД Беларуси лишил аккредитации журналистов канала «Россия»

Власти Беларуси закрыли корпункт ВГТРК в Минске и лишили аккредитации четверых российских журналистов: редактора корпункта **Андрея КОЧУРУ**, *журналиста* **Ирека МУРТАЗИНА**, *оператора* **Сергея ПУШКИНА** *и водителя* **Олега ПИЛЕЦКОГО**. *Белорусские власти объясняют закрытие корпункта ВГТРК в Минске "неправомерной деятельностью" журналистов, сообщил в эфире радиостанции "Эхо Москвы" редактор корпункта Андрей Кочура.*

"Нас сегодня вызвали в МИД, где дали выписку из протокола комиссии, которая занимается аккредитацией иностранных журналистов, и забрали наши аккредитационные карточки, — рассказал Кочура. — *В выписке были два пункта, объясняющие решение МИД: деятельность представительства ведется с нарушением законодательства Беларуси о СМИ, а, кроме того, у представительства нет свидетельства о регистрации".*

Как сообщает "Интерфакс", во внешнеполитическом ведомстве Беларуси не комментируют вопросы, связанные с деятельностью корреспондентов ВГТРК в Беларуси.

Соб инф.

Россия жестко реагирует на решение Минска

ВГТРК считает необходимым заявить, что решение белорусского МИДа вызывает, мягко говоря, недоумение. Расценить его можно только как проявление болезненной мнительности официального Минска в отношении российских СМИ.

"Высказанные в адрес телеканала обвинения в предвзятости абсолютно несправедливы. Мы категорически их отвергаем, поскольку информация о Беларуси в нашем эфире носит объективный и доброжелательный характер. Лишение наших корреспондентов аккредитации, по всей видимости, укладывается в общую логику белорусских властей, ведь за последние два года было прекращено вещание радиостанции "Маяк", резко ограничено вещание телеканала "Культура". Остается лишь сожалеть, что подобные, явно ничем не мотивированные шаги ограничивают возможности россиян получать информацию о братской стране", — сказано в заявлении.

Агентство РИА "Новости" передает, что Москва настаивает на скорейшем возобновлении деятельности представительства ВГТРК в Беларуси. Об этом говорится в сообщении Департамента информации и печати МИД России.

"30 июля в МИД России был приглашен Временный Поверенный в делах Республики Беларусь в Российской Федерации, которому было сделано представление в связи с решением белорусских властей о прекращении деятельности представительства ВГТРК в Республике Беларусь", — говорится в сообщении.

В МИД РФ выразили непонимание принятым в Минске решением. *"Особо было подчеркнуто, что российская сторона считает, что эта акция никак не вписывается в союзный характер отношений между нашими странами и направлена на ущемление свободы слова",* — отмечается в сообщении. *"Российская сторона настаивает на обеспечении возможности скорейшего возобновления деятельности представительства ВГТРК в Республике Беларусь",* — подчеркнули РИА "Новости" в МИД РФ.

Это же агентство сообщило, что спикер Госдумы Борис Грызлов также негативно отнесся к решению официального Минска закрыть в Беларуси корпункт ВГТРК и лишить журналистов российской телерадиокомпании аккредитации. Об этом он заявил в пятницу журналистам.

"Я думал, ни у кого нет сомнения, что корпункт должен работать. Другой оценки ситуации нет", — подчеркнул Грызлов. Он также отметил, что если есть препятствия (у работающих в Беларуси журналистов), то их надо устранять.

СКАНДАЛ

Официальный Минск посадил-таки россиян на чемоданы!

Александр КЛАСКОВСКИЙ

Официальный белорусский лидер любит повторять, что в начале 90-х местные националисты-де "посадили на чемоданы" всех тутошних русских. И, сами понимаете, только мудрость первого президента уберегла страну от антироссийской вакханалии.

Правда, ни одного русского, сидевшего на чемоданах при Шушкевиче, народу так и не явили (может, затравленные профессором бедолаги до сих пор боятся вылезть на свет божий?).

Зато все видят другое. По милости нынешних властей уже регулярно садятся на чемоданы российские журналисты. Свежий пример — скандал вокруг корпункта ВГТРК.

В принципе народ к подобным сюжетам даже привык. Уже выдворяли энтэвэшников Ступникова и Селина, мариновали в белорусской тюрьме Павла Шеремета с ОРТ, а грозных проработок в наших инстанциях собкоровской братии, пишущей для московских изданий, и вовсе не счесть.

На сей раз, кто забыл, претензия свелась к тому, что в репортаже на телеканале "Россия" был раздут масштаб акции 21 июля. В тот день, как помните, оппозиция по-своему отмечала 10-летие правления Александра Лукашенко.

Кстати, насчет масштаба акции — вопрос дискуссионный. Если в районе ЦУМа милицейская видеокамера действительно выхватила не более 150—200 манифестантов, то на площади Бангалор участников было уже на порядок больше. А если взять национальный масштаб (дату отмечали ведь не только в столице!), то получается, что коллега ничего и не раздул.

Так или иначе, оргвыводы со стороны официального Минска, после которых корпункт ВГТРК парализован, выглядят неадекватно жесткими. За что белорусскому руководству и попенял (официально это называется — "сделал представление") российский МИД, позвав на ковер временного поверенного из посольства нашей страны.



Тут, правда, и другой вопрос на языке вертится. А почему же Москва так выборочно замечает, что у соседей неладно со свободой слова и прочей демократией?

Помнится, последнее жесткое заявление российского МИДа в адрес Минска прозвучало в феврале, когда разразилась знаменитая газовая война.

В частности, было заявлено, что *"на президенте Белоруссии лежит ответственность за те системные ошибки во внутренней и внешней политике страны, которые тормозят социально-экономическое развитие государства и которые уже привели к изоляции Белоруссии на международной арене".*

Но когда войны утихают, снова журчит идиллический ручеек интеграционных речей. Союзники, общий язык, нерушимые узы и все такое.

Два месяца назад в мидовской высотке на Смоленской площади российской столицы автор этих строк имел возможность спросить у г-на Лощинина, первого заместителя главы их дипломатического ведомства: так когда же устами Москвы глаголет истина?

Ответ был иллюстрацией тезиса, что язык дан дипломату, дабы скрывать мысли.

В общем, нетрудно сделать вывод: Москва и Минск меряют свои взаимоотношения двойными стандартами. Господствуют не высокие принципы, а соображения политической конъюнктуры. И порой — откровенно приземленные, если не циничные.

В итоге — то братаются, то, говоря по-путински, мочат друг друга в сортире.

"В принципе наша свобода слова мало кого в Москве волнует, — сказал в интервью *"Белорусским новостям"* минский политолог **Виталий СИЛИЦКИЙ**. — *Москва элементарно озабочена тем, что с усечением и вытеснением ее каналов сужаются возможности влиять на белорусское общественное мнение".*

Эксперт добавил: российские электронные СМИ сегодня вряд ли принципиально свободнее белорусских. И если они жестко критикуют политику наших властей, то лишь потому, что дается отмашка из Кремля.

Это, кстати, на заметку тем отечественным демократам, что готовы подхватывать любую московскую песню, лишь бы припевом в ней было нечто ругательное в адрес Лукашенко.

Вот и сейчас Москва смешала все в одну кучу. В связи со свежим скандалом вывалили ворох обид: мол, Минск планомерно удушил вещание "Маяка", "Юности", "Голоса России" и т.д.

Признаться, когда мой раритетный трехпрограммный приемник перестал фонтанировать великодержавным шовинизмом "Голоса России", ваш покорный слуга только поаплодировал.

Иным московским деятелям, конечно, было бы сподручно "по ящику" втюривать белорусу тот же набор, что рязанцу или чукче. Но так уже не получится. Ни при авторитарном Лукашенко, ни при любом сверхдемократе у руля Беларуси.

То есть суверенизация информационного пространства независимой страны — вполне естественный, закономерный процесс.

Соль в другом: **а что взамен?**

И вот здесь остается только глубоко вздохнуть. Меняют-то, мягко говоря, шило на мыло.

Даже сам Александр Лукашенко регулярно пеняет телевизионным начальникам за низкое качество информационного продукта. Хотя как прыгнешь выше пояса? Порочен ведь сам принцип, когда электронные СМИ из общественных превращены в казенные.

Но это уже отдельная большая тема.

...А птичку все равно жалко.

Сажать на чемоданы российских журналистов в любом случае негоже. Если не из любви к свободе слова, то хотя бы из утилитарных соображений.

Теперь, после такого пинка, в телесюжетах ВГТРК на белорусскую тему вряд ли добавится теплоты к официальному Минску.

НАЕЗД

Абараняцца лепей, чым бегчы

Разгубленасць — вось тое слова, якім можна ахарактарызаваць настрой, які пануе гэтымі днямі ў сценах Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта. Назаўтра пасля прэс-канферэнцыі, на якой кіраўніцтва ЕГУ дэкларавала намер змагацца да канца дзеля захавання унікальнай навучальнай установы, у калідорах і аўдыторыях навучальнага корпуса на вуліцы Броўкі стаяў тлум, які бывае ў чакальнай зале чыгуначнага вакзала пры абвестцы аб падыходзе цягніка.

У калідоры чацвёртага паверха на сцяне фарбаю з балончыка напісана "Умрем, но из здания не уйдем!" (не інакш аўтар "экстрэмісцкага" слогана перарабіў на свой капыл сакральны надпіс з Брэсцкай крэпасці). Але ў гэтым калідоры пуста і ціха. Тут ужо здзейснена "эвакуацыя". А ўвогуле ЕГУ павінен ачысціць увесь будынак ад сваёй прысутнасці да 5 жніўня. Тэрмінова шукаюць памяшканне, куды можна звезці на часовае захаванне бібліятэку, камп'ютэры, архіў універсітэта. Частку маёмасці кафедры дызайна, да прыкладу, згадзіўся некаторы час захоўваць у сваёй майстэрні адзін з выкладчыкаў гэтай кафедры. Транспарту для "эвакуацыі" няма. Дзеля грамадскай патрэбы "мабілізаваныя" прыватныя "колы" выкладчыкаў ЕГУ.

Універсітэт ужо даўно знаходзіўся ў завіслым стане. Чыноўнікі міністэрства і ўсялякія правяраючыя ўжо даўно раілі кіраўніцтву ЕГУ падагнаць навучальныя праграмы пад агульны стандарт і рэзка скараціць кантакты з замежжам. Асобы на высокіх пасадах услых называлі ЕГУ "прахадным дваром"...

Сёння "двор" закрылі. Праўда, кіраўнік адной з кафедр сказаў мне, што ЕГУ не закрылі, а толькі пазбавілі ліцэнзіі на адукацыйную дзейнасць — як юрыдычны суб'ект універсітэт па-ранейшаму існуе. На маё пытанне, а што засталося ад універсітэта пасля страты ліцэнзіі і чым, акрамя адукацыйнай дзейнасці, універсітэт можа займацца, уцямнага адказу я не пачуў.

Цяпер, калі стан ЕГУ нарэшце акрэсліўся і добрых навін, відавочна, не будзе, ад выкладчыкаў (удакладню, ад некаторых) можна пачуць крытычныя закіды ў адрас рэктара А. Міхайлава і першага прарэктара У. Дунаева. Маўляў, замест таго, каб лётаць па замежжы і ручкацца з VIP-персонамі, хай бы болей дбалі пра універсітэцкія справы на радзіме. Замест таго, каб супакойваць стомленых бясконцымі праверкамі і прыхаванымі пагрозамі выкладчыкаў калыханкай пра "заграница нам поможет", трэба было альбо шукаць паразумення з уладай альбо "рыхтаваць запасны аэрадром" і дамаўляцца з апанентамі рэжыму, звяртацца да грамадскай думкі. Трэба было справу рабіць, а не на прэзентацыях тусавацца. Не ведаю, наколькі гэтыя закіды справядлівыя, але па-чалавечы разумею людзей, якія яшчэ ўчора мелі працу і сякія-такія грошы, прыстойны статус, а сёння апынуліся пасярэдзіне палонкі нікому не патрэбныя. Разумныя і абачлівыя развіталіся з ЕГУ яшчэ паўгода таму...

Як суб'ект беларускай сістэмы адукацыі ЕГУ болей не існуе. Большасць ягоных кафедр возьме сабе Інстытут парламентарызму і прадпрымальніцтва. Выгада простая: ІПП атрымлівае ў карыстанне раскручаны брэнд і гэтым падвышае свой уласны, не надта высокі статус. Як і чакалася, ВНУ першага "эшалону" цікавасці да лёсу студэнтаў і выкладчыкаў ЕГУ не выказалі. Тэалагічны факультэт пад крылом БДУ — не паказчык. Проста нельга было звольніць з працы дэкана — уладыку Філарэта, таму дзеля захавання ягонага асабістага іміджу парупіліся і пра факультэт. Не надта верачы ў поспех, хутчэй па інерцыі, дзеля выканання рытуалу студэнты і выкладчыкі ўжо віртуальнага ЕГУ паспрабуюць шукаць праўды ў судзе. Вынік гэтых зваротаў прагназаваць лёгка. Але заўжды лепей нешта рабіць, чым сядзець склаўшы рукі, ці, як слушна казаў Мантэнь, "абараняцца заўжды лепей, чым бегчы".

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ.

Ута ЦАПФ: Рэпрэсіі супраць ЕГУ павінны быць спыненыя

Намесніца дакладчыка па знешнепалітычных пытаннях сацыял-дэмакратычнай фракцыі бундэстага ***Ута Цапф*** *перакананая, што сітуацыя вакол Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта можа значна пагоршыць дачыненні паміж Беларуссю і Нямеччынай ды Беларуссю і Еўрасаюзам.*

У спецыяльнай заяве прадстаўніцы нямецкага парламента, якую падае Радыё Свабода, гаворыцца: *"Рэпрэсіі супраць Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта павінны быць спыненыя, а сама ўстанова павінна працаваць.*

..Без перабольшання, рэпрэсіі супраць ЕГУ робяцца ў выніку палітычна матываванага ціску. Ужо працяглы час урад імкнецца змясціць з пасады рэктара Анатоля Міхайлава. Вельмі відавочнымі выглядаюць спробы ліквідаваць гэты апошні незалежны беларускі універсітэт.

Беларускі ўрад павінен спыніць усе рэпрэсіі і аднавіць нармальныя ўмовы для існавання гэтай навучальнай установы. Закрыццё ЕГУ выклікала б цяжкую напружанасць у дачыненнях Беларусі з Нямеччынай і ЕС".

www.charter97.org

КАДРАТРУС

Лукашэнка звольніў Анатоля Цюцюнова. І не толькі яго...

Аляксандр Лукашэнка вызваліў ад займаемых пасад намесніка прэм'ер-міністра краіны Анатоля Цюцюнова і старшыню канцэрна "Беллеспаперпрам" Фёдара Курса, вінаватых у невыкананні даручэння прэзідэнта. Як паведамляе прэс-служба кіраўніка беларускай дзяржавы, гаворка ідзе пра зрыў рэканструкцыі "Светлагорскага цэлюлозна-кардоннага камбіната". *"Цяганіна і зрыў выканання любых даручэнняў прэзідэнта па рэалізацыі важных для жыцця краіны эканамічных праектаў недапушчальныя і цягнуць за сабой неадкладныя кадравыя рашэнні",* — заявіў у чацвер у ходзе нарады Лукашэнка.

Раней камбінат з'яўляўся ўласнасцю дзяржавы. На дадзены момант доля дзяржавы ў статутным фондзе "Светлагорскага ЦКК" складае 47,2%. У апошнія гады прыватныя акцыянеры практычна не прымалі ніякага ўдзелу ў фінансавым аздараўленні камбіната, у сувязі з гэтым яго дзейнасць не прыносіла рэальнай аддачы.

"Узнікла пытанне аб долі дзяржавы ў статутным фондзе "Светлагорскага ЦКК". У дзяржавы няма кантрольнага пакета акцый. У свой час на заранку рынкавай эканомікі "разумнікі" прадалі гэтае прадпрыемства нейкім акцыянерам, а яны там за дзесяць год ні разу не пабывалі. Акцыянеры і не думаюць аб тым, каб развіваць гэтае выгаднае і перспектыўнае прадпрыемства. Для гэтага ж патрэбна ўкладаць грошы. Вось вам інвестыцыі і прыватызацыя. Таму была пастаўлена задача перад урадам: неадкладна вярнуць прадпрыемства дзяржаве аж да ліквідацыі гэтага акцыянернага таварыства, калі яны не хочуць рэканструяваць прадпрыемства, а проста губяць яго", — заявіў А.Лукашэнка.



Не перажывайце, Анатоль Дзмітрыевіч! Работы на ваш век хопіць...

Ён даручыў на працягу тыдня ўнесці на яго разгляд праект указа "Аб фінансаванні будаўніцтва другой чаргі цэлюлознага завода ААТ "Светлагорскі цэлюлозна-кардонны камбінат", які будзе прадугледжваць празрыстую і эфектыўную схему кіравання прадпрыемствам. Прэм'ер-міністру Сяргею Сідорскаму і старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Анатолю Тозіку даручана прапрацаваць меры па хутчэйшым завяршэнні будаўніцтва другой чаргі завода.

"Прапануйце акцыянерам уносіць прапарцыянальна грошы ад 15 мільёнаў долараў. Калі адмовяцца — то акцыі забраць. Мы павінны ведаць, каму мы "ўкідваем" такія грошы. Нам патрэбны "празрыстыя" гаспадары. Не пакажуць, хто валодае гэтымі акцыямі, значыць, прымайце рашэнне аб нацыяналізацыі", — заявіў А.Лукашэнка, паведамляе прэс-служба.

www.charter97.org

ГДЕ ЭТО ВИДАНО...

Выпускникам увеличат срок?

Ольга ТОМАШЕВСКАЯ

Министерство образования намерено увеличить срок обязательной отработки по распределению для выпускников бюджетных вузов с 2 до 5 лет. Уже подготовлены соответствующие изменения в закон "О высшем образования", которые вскоре будут представлены в профильную парламентскую комиссию.

Заместитель председателя комиссии по образованию, культуре, науке и научно-техническому прогрессу Палаты представителей **Владимир Зданович** сообщил БелаПАН, что данная поправка уже обсуждалась комиссией и не была ею поддержана. Дело в том, что законопроект и без того предусматривает переход на контрактную форму получения высшего образования за бюджетные средства. В контракте, по мнению Здановича, могут быть определены сроки обязательного распределения для каждого конкретного вуза. *"Мы считаем это более гибким подходом. Кроме того, введение обязательного пятилетнего распределения будет стимулировать переход студентов с бесплатной на платную форму обучения, что не отвечает концепции нашего социально ориентированного государства",* — сказал Владимир Зданович.

Впрочем, тот факт, что поправку не поддержала комиссия по образованию, не означает, что она не будет принята. Скорее всего, отмечает Зданович, предложение Министерства образования будет вынесено на рассмотрение всего депутатского корпуса.

Эксперты негативно оценивают возможность увеличить срок отработки по распределению. Руководитель Независимого института социально-экономических и политических исследований профессор Олег Манаев в интервью "Белорусским новостям" сказал: *"Если это решение будет принято, оно ограничит социальную динамику молодежи. Многие молодые люди в Беларуси, как и в других странах, хотят изменить свой социальный статус, социальную среду. Мировая практика уже отработала разнообразные механизмы, которые стимулируют социальную мобильность молодежи. Ведь современная жизнь мобильна по определению. Сегодня очень много людей, которые подолгу не живут на одном месте, не работают в одной организации и даже меняют профессию. В расширении социальной мобильности людей, в частности, и заключается смысл глобализации".*

В то же время Олег Манаев отметил, что понимает мотивацию руководства страны, которое обеспокоено тем, что многие молодые специалисты стремятся уехать за границу: *"Когда я узнаю, что мои студенты уезжают, мне очень обидно. И я разделяю озабоченность государства. Но я считаю, что решать эту проблему стоит иначе. Надо создавать соответствующие стимулы, чтобы молодые люди, которые приехали учиться в город, не думали с ужасом о возвращении в родное село, о том, какие их там ждут работа, отдых, перспективы. Надо, чтобы люди стремились вернуться, чтобы они знали, что действительно могут изменить ситуацию. Когда таких стимулов нет, люди стремятся уезжать".*

По мнению эксперта, увеличение срока отработки по распределению приведет к тому, что молодежь будет еще больше стремиться к тому, чтобы получать образование за границей. *"И внутри страны люди будут находить различные способы, чтобы избежать распределения, подобные тем, что используются сегодня, чтобы избежать призыва в армию",* — считает Олег Манаев.

У вясковай хаце.

Фота photo.bymedia.net

Электрычка павышанай камфортнасці

З Баранавічаў у Мінск ажыццявіў свой першы рэйс электрацягнік павышанай камфортнасці, нядаўна адрамантаваны лакаматыўным дэпо, што прыналежыць Баранавіцкаму аддзяленню Беларускай чыгункі. На ім дэлегацыя баранавіцкіх чыгуначнікаў прыехала ў Мінск на ўрачыстыя мерапрыемствы, прысвечаныя прафесійнаму святу.

Электрацягнік павышанай камфортнасці ўтрымлівае вагоны другога і трэцяга класаў. Кожны пасажыр, купіўшы білет у вагон другога класа, будзе мець уласнае, абазначанае ў білеце месца. Крэслы ў вагонах другога класа — індывідуальныя з адкідной спінкай. Акрамя таго, камфортныя вагоны абсталяваны кандыцыянерам, у іх ёсць тэлевізар. У новым электрацягніку пасажыры, якія едуць у вагонах усіх класаў, змогуць таксама скарыстацца паслугамі бара.

Галіна ЗАГАДСКАЯ.

МАЗ пазірае на Судан

У бліжэйшыя 3—4 гады аб'ёмы экспарту аўтамабіляў МАЗ у Судан могуць вырасці да 500 адзінак у год. Аб гэтым стала вядома падчас візіту на Мінскі аўтазавод прэзідэнта Судана Амара аль-Башыра.

Паводле слоў генеральнага дырэктара ВА "БелаўтаМАЗ" Валянціна Гурыновіча, МАЗ ужо ажыццяўляе пастаўкі сваёй прадукцыі ў Судан. Летась было пастаўлена каля 40 аўтамабіляў, а сёлета, згодна з падпісаным кантрактам, павінна быць адпраўлена каля 150 аўтамабіляў.

Аляксей АРЭШКА.

ЭКСКЛЮЗИВ

29-летний Анатолий ШУМЧЕНКО — один из лидеров предпринимательского движения, председатель республиканского общественного объединения "Перспектива". Он считает, что заняться общественной деятельностью его вынудили сами власти, которые "не только замучили бизнесменов многочисленными проверками и зачастую необоснованными санкциями, но и поставили предпринимателей на грань физического выживания".

Анатолий ШУМЧЕНКО, председатель РОО «Перспектива»:

«Мой лоб — крепкий»

— Анатолий, заметно оживление предпринимателей в плане проведения протестных акций. Чем это вызвано?

— Сегодня предприниматели поставлены в такие экономические условия, что без радикальных перемен не только в экономике, но и в политике ни о каком развитии бизнеса речи не идет. Мы деградируем настолько, что страшно подумать. Экономические проблемы сегодня приобрели политический шлейф, политическую окраску. Такая сегодня реальность! Любой оппозиционный властям политик найдет живую поддержку у предпринимателей. Общереспубликанская забастовка предпринимателей в поддержку голодающих депутатов ярко продемонстрировала, что никакого просвета в нынешней политической ситуациии нет. Предприниматели как наиболее активная и просвещенная часть общества это понимают.

Мы хотим изменений политической системы, которые повлекли бы за собой изменения экономического курса Беларуси.

— Получается, многие предприниматели наконец-то осознали, прочувствовали на собственной шкуре известное высказывание бывшего британского премьера Уинстона Черчилля: "Если вы не займетесь политикой, политика займется вами"?

— Это действительно так. Экономические законы у нас сегодня не действуют, действует милицейская дубинка. Нынешний режим только и держится на этих дубинках, и предприниматели это начинают осознавать. Кроме того, предприниматели понимают, что милиция, ОМОН содержатся в том числе и за их счет.

— Когда ты пытался защитить Лилию Шиманович с "Раковского кирмаша", с которой хотели разорвать договор аренды, начальник службы охраны рынка Василий Ахрамович дал команду своим подчиненным затащить тебя в какой-то подвал… Почему он тебя так боится, ведь ты не призываешь предпринимателей ни к чему крамольному, незаконному?

— С его стороны это была скорее месть. Кстати, у него была возможность приказать стукнуть меня по голове, но он этого не сделал. Значит, не все еще в нашей стране потеряно! А мстил он мне как руководителю "Перспективы", который успешно борется за права предпринимателей, что иногда приводит к финансовым потерям хозяев рынка. Приведу пример: предпринимателям "Раковского кирмаша" предлагали заплатить по 5 миллионов рублей за роллеты, при этом 330 торговых мест должны были быть сокращены до 180. Я написал ряд писем в госорганы, была прокурорская проверка. И результат был достигнут. Сокращений не было, все работают, договора продлены до сентября, мзду никто не заплатил.

— Ты часто встречаешься с предпринимателями других городов. Как они оценивают нынешнюю власть, какие слова подбирают для ее оценки в приватных беседах?

— Слов немного, больше — эмоций. Любой предприниматель в регионе доведен до отчаяния даже больше, чем в столице. Но там, в провинции, предприниматели стали значительно смелее, и это хороший знак. Приведу лишь один пример: недавно предприниматели, активисты "Перспективы" из Речицы, Светлогорска, Рогачева, Жлобина прорвались в здание Гомельского облисполкома, пришли к вертикальщикам и сказали им открыто в лицо: "Мы устали бороться с ветряными мельницами, устали быть неуслышанными, устали, когда нам говорят, что черное — это белое, а белое — это черное. Мы понимаем, что в нашей стране экономическая ситуация не поменяется при нынешней власти, и поэтому мы вам заявляем, что будем выдвигать требования о смене власти".

— Ты считаешь, что только власть виновата в том, что предприниматели вынуждены заняться политикой?

— Власть виновата, это однозначно. Но, с другой стороны, предприниматели должны сами понимать, что есть Конституция, есть законы, есть парламент, есть демократические ценности, которые необходимо защищать.

— Анатолий, подтверди или развей один миф. По телевидению, в государственных печатных СМИ постоянно говорят о том, что жизнь у белорусов улучшается не по дням, а по часам, денег у них все больше и больше. Если верить госпропаганде, то товары у предпринимателей должны разлетаться в один момент. Это так?

— Ты сам уже ответил на свой вопрос. Все это — миф. Покупательская способность населения крайне низкая. Предприниматели — это своебразный индикатор состояния экономики. На минском рынке "Свелта", к примеру, в одну палатку становятся четыре предпринимателя, а гомельские торговцы берут в долг стаканчик кофе, который стоит 200 рублей. О каком экономическом чуде можно вести речь?

— Западный предприниматель в отличие от белорусского политикой не занимается. Для него государством созданы простые и понятные условия. Например, в Канаде, насколько я знаю, первые пять лет предприниматель вообще не платит налогов. Зато наш вынужден вятягиваться в вечную и неблагодарную борьбу с налоговыми и другими "карательными" органами… Какими качествами должен обладать отечественный бизнесмен, чтобы выжить?

— Он должен обязательно иметь крепкое здоровье и крепкую нервную систему. Мы живем в лукашенковской Беларуси — и этим все сказано. В соседней России налоги в пять-десять раз ниже, чем у нас, в Украине нет никаких проблем зарегистрировать предприятие, на Западе для открытия фирмы нужно пять минут. Вот когда наш предприниматель будет находиться в таких условиях — тогда можно будет вздохнуть с облегчением, а пока...

— Ради неблагодарного и зачастую опасного труда по защите прав предпринимателей ты, Анатолий, оставил свой бизнес, подвергаешься притеснениям, репрессиям. Скажи честно, зачем тебе это нужно? Президентом стать захотелось?

— Я просто хочу изменить судьбу — свою личную, а также людей, которых я объединил. Если для этого понадобится стать президентом, то я этого добьюсь. Году этак в 2011-м, когда мне стукнет 36. Корыстных интересов у меня нет. У нас в Беларуси очень много талантливых людей, но, чтобы их талант нашел должное применение, сначала нужно пробить стену, которую возвел режим Лукашенко. А для этого нужно иметь крепкий лоб. Мой лоб — крепкий.

— А не боишься повторить судьбу исчезнувших — Захаренко, Гончара, Красовского, Завадского?

— Боюсь. И считаю, что исчезновения политических оппонентов могут повториться. Последние случаи с избиением Фролова и нападением на Антончика подтверждают это. Задаю себе вопрос: неужели белорусам нужны новые жертвы, чтобы они, наконец, поняли, что в стране происходит что-то не то? Если наш народ и политические силы, в том числе зарубежные, тему исчезнувших политиков будут отодвигать на второй план, то у нас есть большие шансы столкнуться с ней вновь.

— Ты снова мне напомнил Черчилля, который говорил своей нации в начале войны: "Кроме крови и пота мне вам предложить нечего…"

— Абсолютно верно! Демократию на блюдечке белорусам никто не приподнесет. Ни с Запада, ни с Востока. Мы сами должны навести порядок в своей стране.

Беседовал Александр СИЛИЧ.

БЛІЦ-КАМЕНТАРЫЙ

Фінансы спяваюць рамансы?

Гэтыя навіны прыйшлі ў адзін дзень. Вось яны. Агенцтва БелаПАН паведаміла, што акцыі Глыбоцкага кансервавага завода на суму больш як мільён еўра перайшлі ва ўласнасць дзяржавы і што, на думку кіраўніка Нацбанка краіны, на стварэнне ўмоў для ўвядзення адзінай валюты з Расіяй спатрэбіцца каля двух гадоў. На прэзідэнцкім сайце з'явіўся каментарый указа № 350, а расійская "Независимая газета" ў сваім артыкуле сцвярджае, што ў Беларусі буйнешыя прадпрыемствы зноў пераходзяць у дзяржаўную ўласнасць.

Кожная навіна нібыта аб розным. Але не пакідае ўражанне, што яны высвечваюць адну вельмі важную праблему. Расійская "Независимая газета" нагадвае, што днямі ў краіне зменена форма ўласнасці і вернуты статус дзяржаўнага унітарнага прадпрыемства буйнейшаму вытворцу фармацэўтычнай прадукцыі "Белмедпрэпаратам". Яна робіць вывад, што гэта крок на шляху перагляду вынікаў прыватызацыі: маўляў, улада хоча займець прыбытковыя прадпрыемствы. Паведамленне агенцтва БелаПАН з Глыбоцкага кансервавага завода толькі пацвярджае такую лінію.

У сувязі з гэтым невыпадкова з'явіўся і ўказ № 350, з "прыняццем якога ствараецца адзіная і цэльная схема ўліку, ацэнкі і рэалізацыі нерухомай маёмасці і каштоўных папер, вернутых у даход дзяржавы".

Нехта можа падумаць: а пры чым тут заява кіраўніка Нацбанка аб увядзенні расійскага рубля ў Беларусі? Ну як жа пры чым? З папярэдніх інфармацый відаць, што ўлада спрабуе авалодаць прыбытковымі прадпрыемствамі ці павялічыць у іх сваю долю. Значыць, патрэбны грошы. А ўвядзенне расійскага рубля ў Беларусі чыноўнікі звязваюць з паступленнем немалых сродкаў з Расіі. Вось і пасылаецца сігнал усходняй суседцы: маўляў, мы не забыліся пра ваш рубель. Кіраўнік Нацбанка заяўляе, што пры ўмове больш актыўнага развіцця інтэграцыйных працэсаў адзіная эканамічная прастора можа быць створана меней чым праз два гады, і беларускі бок не выключае, што ў якасці адзінай валюты можа быць выбраны расійскі рубель.

Як бачым, розныя навіны высвечваюць адну праблему: у краіне не хапае фінансавых сродкаў, ці, як кажуць, фінансы спяваюць рамансы, і прымаюцца ўсемагчымыя захады, каб неяк іх павялічыць. Толькі ці не прывядуць прымаемыя меры да зваротнага эфекту? Ці не стануць прыбытковыя калектывы працаваць горш пасля змены формы ўласнасці?

Яўген ТАЎГЕНЬ.

КЛИНИКА

Когда в ноябре прошлого года активистку Объединенной гражданской партии (ОГП) Антонину Ковалеву, бывшего частного нотариуса, за выписанный "задним числом" и незаконный, на ее взгляд, штраф в размере порядка 16 тысяч долларов лишили возможности выехать за пределы Беларуси, многие подумали: это всего лишь частный случай.

Недавно отдел паспортно-визовой службы Партизанского района г.Минска ограничил выезд за пределы страны еще одной "виноватой перед государством" дамы — заместителя председателя ОГП **Людмилы ГРЯЗНОВОЙ.** *Официальное основание для запрета покидать синеокую — невыплаченный Л.Грязновой штраф государству в размере 225 базовых величин (около 2000 долларов) за организацию акции "Чернобыльский шлях" 26 апреля. Причем среди всех организаторов шествия штрафом "наградили" исключительно ее. Остальные или не явились в суд, или отделались "сутками".*

Людмила Грязнова считает, что государство стало еще жестче закручивать гайки, пытаясь задушить гражданское общество в Беларуси. А запрет не выезжать за рубеж она рассматривает как начало установки государством для граждан страны нового "железного занавеса". Только уже не советского, а лукашенковского.

Невыездная

Людмила Грязнова считает, что такая же участь может постигнуть многих

— Людмила Николаевна, ведь Вы не впервые страдаете за Вашу гражданскую активность? Раньше, бывало, сидели…

— Да, у меня было уже два тюремных срока — один, правда, короткий — сутки, второй — пятнадцать суток. Мне и штраф огромный приходилось выплачивать — примерно 900 долларов. Выплачивала его частями в течение двух лет, потому что была не в состоянии сделать это сразу.

— Пытались ли власти раньше ограничить Вам свободу передвижения?

— Никаких проблем с паспортно-визовой службой, никаких ограничений в правах, что касается выезда за рубеж, раньше не было. И у других активистов оппозиции были огромные штрафы — до трех тысяч долларов, которые постепенно выплачивались. Ни к кому не применялась такая мера пресечения, как лишение права выезда за границу.

— Вы считаете это инициативой Партизанского РОВД?

— Конечно же, нет. Инициатива шла сверху. С самого верха, в этом не сомневаюсь. Многие исполнители таких инициатив, кстати, рядовые чиновники, понимают их абсолютную абсурдность. Но они вынуждены их исполнять. С некоторыми из этих чиновников у меня даже сложились неплохие отношения. Мой судебный исполнитель, например, всегда разговаривает со мной очень вежливо, с пониманием ситуации…

— Вы говорите "мой судебный исполнитель". Прямо как "мой психоаналитик"…

— Да! *(Смеется.)* Судебный исполнитель проникает в нашу жизнь, как новый член семьи. Мы уже все "сроднились". А мера ограничения выезда за рубеж, которая применена ко мне и Антонине Ковалевой, я думаю, будет применяться и к другим лидерам оппозиции.

— Получается, власти изобрели какой-то новый метод борьбы с внутренней оппозицией?

— Это их ноу-хау. Оно, кстати, находится в русле той политики, которая проводится руководством страны по изоляции всех и вся. Им кажется, что если поставят в центре Европы "железный занавес", то будут чувствовать себя полновластными правителями и диктовать всем свою волю.

Говорить о новом методе борьбы властей с оппозицией можно уже смело. И об этом все должны сильно задуматься — как политики, так и предприниматели и интеллигенция. Невыездными могут стать многие. Старт новому "железному занавесу" дан! Ни к чему хорошему это не приведет. Мы маленькая страна, которая имеет шансы развиваться, только интегрируясь с внешним миром. Иного пути нет. В противном случае нация будет вырождаться и вымирать.

Еще, я думаю, невыездной меня сделали в назидание тем неправительственным организациям, которые не хотят или не могут зарегистрироваться в Беларуси. Я сейчас занимаюсь регистрацией "Правозащитного альянса" в Вильнюсе. Они, власти, видно, подумали: не дадим вам, оппозиции, ездить за рубеж, в Литву, не дадим вам, легального статуса здесь на родине, а значит, не дадим вам работать.

— Что планируете делать дальше?

— Как написали на одном из форумов в Интернете, *"Грязнова теперь будет землю рыть на родине"*. Что ж, и в самом деле буду активизировать свою деятельность здесь, в Беларуси.

— Когда Вы выплатите полностью штраф, Вам вернут право покидать территорию Беларуси?

— Не уверена. Но, как вы знаете, обратный процесс всегда более длительный. Как мне объяснили юристы, чтобы выйти из "черного списка" людей, "провинившихся перед государством", нужно гораздо больше времени, чтобы попасть в этот список. Что будет сейчас, если я попробую выехать, скажем, в Киев? Даже если не аннулирован разрешительный штамп в паспорте, теперь любой таможенник, ознакомившись с "черным списком", зажжет передо мной красный свет.

— После того как в 1996 году Вы поставили свою подпись под импичментом Лукашенко и отказались идти в подконтрольную ему Палату представителей, Вам, насколько я знаю, практически невозможно найти работу. На какие средства Вы живете?

— Последние годы мне живется непросто. Я выживаю только благодаря помощи сочувствующих (спасибо им за это большое!). А что касается отсутствия работы, то это не только моя история, это история большинства депутатов, подписавших импичмент. Почти все не смогли устроиться на работу и были лишены средств к существованию. Мое дело и дела некоторых других депутатов рассматривались Межпарламентской ассамблеей в Женеве, по моему делу было принято решение восстановить меня на работе. В 2001 году власти действительно мне предложили вернуться на доцентскую должность в БГУ, где я работала раньше. Но мне пришлось отказаться из-за того, что семь лет была вне специальности. И я была уверена, что если бы они меня взяли, то через месяц-другой уволили бы "по профнепригодности".

— Недавно с большим трудом смог получить законную пенсию еще один подписавший импичмент депутат Верховного Совета 13-го созыва Валерий Щукин. Вас же не пускают за границу… Не кажется ли Вам, Людмила Николаевна, что власть поставила перед собой цель изморить опальных депутатов физически, довести их до голодной смерти?

— Если кто-то пугается собственной тени и в страхе пытается загнать противника в угол, то это его собственные проблемы. Мы, депутаты Верховного Совета 13-го созыва, подписавшиеся под импичментом президенту, преследуем другую цель. Не вступая в рукопашный бой с обиженной властью, боремся за симпатии населения, за поддержку электората, за европейскую альтернативу для Беларуси. Тактика "око за око, зуб за зуб" — недостойна политического деятеля.

Наталья ГАК.

Из Конституции:

Статья 30

Граждане Республики Беларусь имеют право свободно передвигаться и выбирать место жительства в пределах Республики Беларусь, покидать ее и беспрепятственно возвращаться обратно.

Статья 23

Ограничение прав и свобод личности допускается только в случаях, предусмотренных законом, в интересах национальной безопасности, общественного порядка, защиты нравственности, здоровья населения, прав и свобод других лиц.

Никто не может пользоваться преимуществами и привилегиями, противоречащими закону.

Комментарий

Гарри ПОГОНЯЙЛО, правозащитник, РОО «Белорусский Хельсинкский комитет»:

— Примененная к Грязновой мера, связанная с запретом выезда за рубеж, основана на действующем в Республике Беларусь законодательстве. На самом деле на этот счет действует закон "О порядке выезда..." и соответствующие президентские документы.

Если же говорить о международных стандартах и обязательствах Республики Беларусь, которые она на себя взяла в области прав человека, то это нарушение прав человека, и такая практика может быть признана незаконной Конституционным судом.

Людмила Николаевна, на мой взгляд, должна обратиться в суд общей юрисдикции, пройти национальные судебные инстанции, а затем направить жалобу в Комитет по правам человека ООН в Женеве. Но эта дорога, которую надо пройти, может растянуться на два-три года.

Прытулак для тых, хто стаў ахвярай гандлю людзьмі

Адкрыццё ў Мінску спецыялізаванага прытулку для ахвяр гандлю людзьмі — гэта не толькі адзін з відавочных вынікаў праекта па барацьбе з гэтай з'явай, але і імкненне Еўрапейскага Саюза да "наладжвання добрасуседскіх адносін з народам Беларусі". Пра гэта заявіў кіраўнік офіса TACIS у Беларусі Ёахім Леман, выступаючы падчас цырымоніі адкрыцця рэабілітацыйнага прытулку для ахвяр трафіку.

"Такая дапамога асабліва патрэбна, паколькі ахвяры часта знаходзіліся ў жудасных умовах і, як вынік, атрымалі сур'ёзныя фізічныя, сексуальныя і псіхічныя траўмы, — сказала прадстаўнік ААН/ПРААН у Беларусі Джыхан Султанаглу. — *Хваробы, што перадаюцца палавым шляхам, ВІЧ-інфекцыя і СНІД часта з'яўляюцца вынікам прымушэння жанчыны да прастытуцыі. Трывога, бяссонніца, дэпрэсія і пасттраўматычны стрэс з'яўляюцца агульнымі праяўленнямі стану псіхікі ахвяр. Мы спадзяёмся, што гэты прытулак стане часовым домам для ахвяр гандлю людзьмі".*

Паколькі Беларусь знаходзіцца на перакрыжаванні Усходу і Захаду, прадстаўнік ААН выказала пажаданне, каб "гэтае цудоўнае месца ў цэнтры Еўропы выкарыстоўвалася не ў мэтах "экспарту" дзяўчын і жанчын для эксплуатацыі ў іншых краінах, а ў мэтах узаемавыгаднага супрацоўніцтва ў галіне эканомікі, культуры і іншых галінах". *"Я спадзяюся, што гэты цэнтр будзе бяспечным прытулкам для ахвяр гандлю людзьмі,* — падкрэсліла Д.Султанаглу. — *Я таксама спадзяюся, што патрэба ў ім хутка адпадзе".*

Вольга АСІПЕНКА.

Заплаці — купім прадуктаў і наколем дроў

У Мазыры прапрацоўваецца першая ў Беларусі комплексная сістэма аказання розных, у тым ліку і бытавых, паслуг састарэлым грамадзянам. Пра гэта паведаміла на прэс-канферэнцыі ў Мінску начальнік упраўлення вытворчай і тэхнічнай палітыкі Беларускага дзяржаўнага аб'яднання арганізацый бытавога абслугоўвання насельніцтва (Белбыт) Галіна Мыцько.

Паводле яе слоў, гэта будзе не проста асобная паслуга, а менавіта сістэма па аказанні штодзённай дапамогі састарэлым людзям, каб забяспечыць ім "нармальнае жыццё". Акрамя стандартных бытавых паслуг, новая сістэма прадугледжвае таксама аказанне дапамогі ў апрацоўцы агародаў, рубцы дроў, уборцы памяшканняў, закупцы прадуктаў у магазінах і іншых штодзённых справах. Усе паслугі будуць платнымі, але, магчыма, частку затрат у якасці субсідый арганізацыям бытавога абслугоўвання возьмуць на сябе гарадскія ўлады.

Лавінія АРЭШКА.

«Бе-Ла-Русь» — лагер без агароджы

Адразу на 600 чалавек павялічылася насельніцтва Верхнядзвінскага раёна Віцебшчыны. Тут, у наваколлі знакамітага Кургана Дружбы, на збегу рубяжоў трох былых савецкіх рэспублік, а цяпер — трох суверэнных краін, пачаў дзейнічаць сезонны маладзёжны лагер "Бе-Ла-Русь", які ўжо ў 13-ы раз сабраў у маляўнічым прыродным атачэнні маладых прадстаўнікоў Беларусі, Латвіі і Расіі (адсюль і трохскладовая назва лагера). На працягу некалькіх дзён часовыя месцічы палатачнага пасёлка будуць ладзіць спартыўныя спаборніцтвы, весяліцца на дыскатэках, выяўляць мацнейшых у розных інтэлектуальных гульнях, бавіць вольны час у лесе і на возеры.

Арганізатары лагера, які стаў ужо традыцыйнай акцыяй, спадзяюцца, што чарговая міжнародная сяброўская сустрэча моладзі дапаможа ўмацаваць культурна-дзелавыя сувязі трох памежных краін.

Агняборцы паказалі вышэйшы клас

Новыя выратавальныя магчымасці, якія надала пажарным 50-метровая лесвіца, зманціраваная на шасі грузавіка маркі КамАЗ, прадэманстравалі днямі ўдзельнікам рэспубліканскай нарады спецыялістаў пажарных службаў у Віцебску іх мясцовыя калегі-выратавальнікі.

Базай нарады стаў Віцебскі тэлезавод, дзе выпускаюцца не толькі папулярныя каляровыя "Віцязі", але і эфектыўныя сродкі барацьбы з пажарамі.

Акрамя таго, менавіта на гэтым прадпрыемстве ў свой час быў створаны пажарны аварыйна-выратавальны атрад "Віцязь", на рахунку якога шмат прафесійных поспехаў і сапраўды гераічных дзеянняў у экстрэмальных умовах.

Удзельнікі нарады — прадстаўнікі ўсіх рэгіёнаў Беларусі — прысутнічалі на паказальных баявых вучэннях "Віцязя", што, як і чакалі, выклікаў усеагульнае захапленне і заслужыў адзнаку "выдатна" ад кіраўнікоў Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.

Госці Віцебска пазнаёміліся з вытворчым працэсам і тэхналагічнымі навінкамі тэлезавода.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

Опера едзе ў Сопат

Артыстаў беларускай оперы запрасілі ўзяць удзел у Міжнародным оперным фестывалі ў Сопаце (Польшча).

6 жніўня артысты Вялікага тэатра оперы прадставяць на сцэне Лясной оперы ў Сопаце оперу "Князь Ігар" Аляксандра Барадзіна.

Юлія ЦЯЛЬЦЕЎСКАЯ.

Ці вернуць «згарэўшыя зберажэнні»?

Праект закона "Аб аднаўленні і ахове зберажэнняў грамадзян", магчыма, будзе разгледжаны ў першым чытанні на восеньскай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі. Адпаведны дакумент падрыхтаваў і накіраваў на ўзгадненне ў шэраг зацікаўленых ведамстваў дэпутат Палаты прадстаўнікоў **Уладзімір НАВАСЯД.**

Як паведаміў аўтар законапраекта, у яго распрацоўцы ўдзельнічалі юрысты ўзначальваемай ім арганізацыі "Грамадзянскі форум". Прычым, паводле слоў У.Навасяда, група распрацоўшчыкаў узяла за аснову аналагічныя праекты законаў, якія прыняты і ўжо рэальна працуюць ва Украіне, Кіргізіі і Казахстане.

Сутнасць законапраекта, сказаў У.Навасяд, заключаецца ў тым, што ўсе зберажэнні грамадзян, "згарэўшыя" на пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя, павінны быць прызнаны ўнутраным доўгам дзяржавы. *"Пасля распаду Савецкага Саюза падобным чынам паступілі многія краіны, у тым ліку і найбліжэйшыя суседзі Беларусі",* — сказаў парламентарый. Паводле слоў У.Навасяда, ён ужо атрымаў першае станоўчае экспертнае заключэнне на свой законапраект з Міністэрства фінансаў. Мінфін паведаміў таксама, што ў выпадку прыняцця законапраекта сума дзяржаўных выплат уладальнікам савецкіх зберажэнняў складзе 62,3 трыльёна рублёў (з разліку абмену: 1 савецкі рубель — 2 тысячы беларускіх рублёў).

Аднак, у адпаведнасці з праектам, гэтыя выплаты дзяржава можа замяніць акцыямі прадпрыемстваў або разлічыцца з грамадзянамі праз прадастаўленне падатковых ільгот на адпаведную суму.

Законапраектам прадугледжваецца, што ўсе зберажэнні грамадзян, згубленыя пасля распаду СССР, будуць вернутыя дзяржавай на працягу 2006—2011 гадоў.


Паводле слоў У.Навасяда, зараз праект закона праходзіць экспертызу ў міністэрствах эканомікі, юстыцыі і па падатках і зборах. У выпадку атрымання іх станоўчага заключэння яго можна будзе афіцыйна ўнесці ў Палату прадстаўнікоў.

Юрый ПАЦЁМКІН.

Народная Воля
31 ЛІПЕНЯ 2004 г.

Летом многие забывают, как нужно одеваться на работу

Голые плечи, обнаженный живот, неухоженные ноги — вот лишь некоторые из самых страшных грехов, недопустимых на рабочем месте. Но летом многие британцы забывают об этих железных правилах



Когда наступает жара, на работу идти особенно не хочется, но каждое утро приходится отправляться в офис. Перед женщинами стоит вечный вопрос что надеть? Может быть, платье в цветочек и открытые босоножки? В таком наряде хорошо появиться на открытой террасе кафе после работы, но не в рабочем офисе.

Однако женщина готова рискнуть... И надо же, именно в этот день ее срочно вызывает шеф.

"Мне кажется, многие забывают, что есть разница между домом и офисом, между рабочими днями и выходными. Летом люди, похоже, забывают, как нужно одеваться на работу", — говорит заведующая отделом моды журнала InStyle Тамзин Доу.

Обычно женщинам труднее, чем мужчинам, решить, что надеть, но летом мучиться над этим вопросом приходится всем. Форма одежды зависит во многом от того, в какой сфере вы работаете.

Если вы связаны с музыкальной индустрией или индустрией моды, то вы не обязаны являться на работу в строгих костюмах, обязательных для финансистов или юристов.

Но, независимо от того, какую работу вы выполняете, для всех существуют **золотые правила**, которые нельзя нарушать ни при каких обстоятельствах. Таково мнение консультанта Ричарда Грея из лондонского престижного магазина Harvey Nichols.

"Возьмем, к примеру, блузки без рукавов. Если вам 14 лет и ваши руки не толще палочки, то только тогда вы можете себе позволить их надеть. Но если у вас, как у 90% всех женщин в Британии, руки — не самая красивая часть тела, то вам лучше от них отказаться", — говорит он. "Юбки выше колена? — продолжает рассуждать вслух Ричард Грей. — Они отвлекают внимание ваших сослуживцев, а коллег-женщин заставляют хмуриться".

Но самые большие прегрешения, по его мнению, допускаются ниже. "Если вы собираетесь надеть открытые босоножки, то, ради всех святых, сделайте педикюр", — призывает Ричард Грей и добавляет, что это касается также и мужчин.

И Тамзин Доу, и Ричард Грей согласны с тем, что, когда становится тепло, не следует, пряча подальше темную зимнюю одежду, забывать о том, как нужно одеваться на работу.

"Правильно одеться в офис трудно всегда, но летом — еще труднее", — говорит Ричард Грей. "Но и в жару не следует оставлять пиджак дома, потому что, может быть, вас вызовет шеф или придут клиенты, и без пиджака вы будете чувствовать себя неловко", — добавляет он.

"Каждое утро нужно спрашивать себя: "А что бы я надел, если бы продвинулся по службе на одну ступеньку?" или "А что бы надел мой начальник?" — вот на это и надо ориентироваться", — советует Тамзин Доу. Она также советует не надевать в офис брюки на бедрах и короткие блузки с большим вырезом.

Би-Би-Си.

ОЛИМПИАДА-2004

Работники афинских гостиниц грозят забастовкой

Работники афинских гостиниц присоединились к многочисленным профсоюзам, грозящим устроить забастовку во время Олимпиады, которая пройдет в греческой столице с 13 по 29 августа.

Профсоюз гостиничных служащих Афин и Пирея объявил, что намерен провести 4 августа предупредительную забастовку.

"Мы не хотим повлиять на успех Олимпиады, но если наши требования не будут удовлетворены, не исключаем забастовки и после 4 августа", — говорится в заявлении профсоюза.

Помимо традиционных упоминаний об "унизительном" уровне оплаты труда и "средневековых" условиях работы, в заявлении профсоюза гостиниц содержатся и достаточно радикальные требования. Например, в категоричной форме предлагается увеличить минимальную зарплату служащим отелей с 500 до 1100 евро.

